**В.А. Буднік**
*(Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт,*
*г. Брэст, Беларусь)*

# ЭЛІЗА АЖЭШКА: БЕРАСЦЕЙШЧЫНА Ў СЭРЦЫ МАІМ

Вывучэнне спадчыны малой радзімы, перш за ўсё культурнай, мае шырокія магчымасці для захавання духоўнасці грамадства, развіцця беларускай літаратуры і культуры, з'яўляецца прадметам асаблівага клопату дзяржавы.

Беларуская зямля дала жыццё многім вядомым польскім пісьменнікам, у шэрагу якіх адно з першых месц належыць Элізе Ажэшка. У гэтым годзе спаўняецца 180 гадоў з дня яе нараджэння.



Творчая спадчына Э. Ажэшка цесна звязана з Берасцейшчынай. Яна пакінула значны след у гісторыі і культуры Брэсцкай вобласці.

На Драгічыншчыне, у вёсцы Людвінава, некалі быў маёнтак, у якім шэсць гадоў пражыла таленавітая пісьменніца Э. Ажэшка. Гэтыя гады яна пазней назвала сваім універсітэтам.

У 1858 г. 16-гадовую Элізу Паўлоўскую, якая нядаўна закончыла закрыты Варшаўскі пансіён, маці выдала замуж за польскага памешчыка Пятра Ажэшку, маёнтак якога знаходзіўся ў Людвінава. Дзяўчынка-падлетак наўрад ці выразна ўсведамляла лёсавызначальнасць гэтага свайго кроку. Шчасця, на жаль, не адбылося.

Э. Ажэшка спачатку захапляльна ўспрымала сваё замужняе жыццё. Ёй падабалася новая роля – гаспадыні дома. Усё захапляла Э. Ажэшка ў Людвінава: уражваў вялікі старадаўні дом з драўлянымі калонамі, пабелены і пакрыты саломаю, поўныя святла і паветра пакоі, абсталяваныя прыгожай старадаўняй мэбляй, парк з каштанавымі, бярозавымі алеямі, з маляўнічымі альтанкамі і прыгожымі сажалкамі.

Першыя гады праляцелі весела і цакава. Маладая сям'я часта прымала ў сябе гасцей, наладжвала балі. Ахвотна бывалі Ажэшкі ў суседзяў. Сябравалі Ажэшкі з Жукамі з Папіна і Русецкімі з Грудковічаў. Наведаліся і да іншых суседзяў.

Недалёка ад маёнтка туліліся мужыцкія хаткі. Сяляне круглы год працавалі на сваіх гаспадароў. Калі ж пільная патрэба прыводзіла іх у панскі дом, то гадзінамі, скінуўшы шапкі, чакалі пана, але ён не выходзіў да іх. Жорсткі, дэспатычны, пазбаўленны духоўных інтарэсаў, Пётр Ажэшка не спачуваў сялянам, лічыў іх гультаямі, зладзеямі і падманшчыкамі. Э. Ажэшка не магла гэтага зразумець у сваім мужы. Як ні прасіла выйсці да іх і дапамагчы, той рэдка калі адгукаўся на жаночыя просьбы. На гэтай глебе пачалі ўзнікаць канфлікты, якія з часам паглыбляліся.

Сама Э. Ажэшка любіла гутарыць з сялянамі, калі яны прыносілі ў двор грыбы ці ягады. Яна заўсёды дабразычліва ставілася да прыгонных. Гэтыя сустрэчы з сялянамі пакідалі вялікі след у душы маладзіцы, абуджалі нейкую, па-

куль што не ўсвядомленую трывогу, нараджалі незразумелыя парыванні. Пазней Э. Ажэшка пісала, што нават тады, калі яна была найбольш легкадумная, жыла бесклапотна, ёй рабілася вельмі сумна і было шкада тых людзей, што яна не магла ўтрымацца ад слёз.

Маладая жанчына пачала шукаць адказы на пытанні, што хвалявалі, у кнігах, якія яна прывезла ў Людвінава з Мілкаўшчыны – бацькоўскага дому. Бываючы ў суседзяў, Э. Ажэшка прыслухоўвалася да спрэчак мужчынаў. Адны з суседаў-шляхціцаў гаварылі, што трэба даць сялянам волю, другія, у тым ліку і яе муж, прытрымлівалія іншай пазіцыі. З часам у гэтыя спрэчкі стала ўмешвацца і Э. Ажэшка. Яна заўсёды трымала бок сялянаў. Адзінства сярод палескіх шляхціцаў наступала толькі тады, калі размова заходзіла пра лёс айчыны, пря яе вызваленне ад паняволення.

У гэты час вярнуўся на Палессе пасля заканчэння Пецярбургскага ўніверсітэта малодшы брат мужа Фларэнт Ажэшка, які быў далучаны да ідэяў рускай рэвалюцыйнай дэмакратыі. Маладая пісьменніца пачынае чытаць М. Някрасава, М. Дабралюбава, М. Чарнышэўскага, А. Герцэна.

Палеская шляхта ў пытаннях вызвалення Бацькаўшчыны ад паняволення, як і іншыя ўдзельнікі паўстання 1863-1864 гг., падзялілася на “чырвоных”, і “белых”. Яе муж далучыўся да “белых”. Гэта яшчэ больш аддзяліла яе ад мужа.

У маленькім салоніку гаспадыні ў Людвіване са спачуваннем гаварылі пра сялянаў, пра тое, што ўсім трэба жыць дзеля высокай мэты, дбаць пра лёс бацькаўшчыны. Пад уздзеяннем прачытаных кніг, палкіх прамоў у яе салоніку Э. Ажэшка думала і пра сваю асабістую дапамогу народу. Яна пачала лячыць людвінаўскіх сялян, адкрыла на свае сродкі школу для дзяцей прыгонных. У гэтай школе вучыла 20 хлопчыкаў.

А між тым на Палессі ішла актыўная праца па падрыхтоўцы да паўстання супраць паняволення радзімы Расіяй. Кіраўніком быў запрошаны кадравы афіцэр Рамуальд Траўгут, які жыў непадалёку ў вёсцы Востраў (цяпер Кобрынскі раён). Па шляхетных маёнтках ствараліся склады зброі. Былі такія склады ў маёнтках Ажэшкаў. Р. Траўгут у лясным гушчары навучаў палескіх паўстанцаў ваеннаму майстэрству. Сувязь паміж кіраўніком палескага атрада і паўстанцкім цэнтрам, паміж лагерам і сем’ямі паўстанцаў падтрымлівалася праз Э. Ажэшка. Як сувязная, яна днямі насілася па Палессі. Улічваючы, што ўрад сцягнуў у наш край вайсковыя сілы і па дарогах снавалі казацкія раз’езды, гэтыя паездкі былі вельмі небяспечныя.

Паўстанцаў трэба было карміць, апранаць, патрэбны былі медыкаменты, бінты. Э. Ажэшка арганізавала жанчын паўстанцаў для гэтай справы. Калі пачаліся баі і паявіліся параненыя, разам са Стэфаніяй Жук у маёнтку Божыдар адкрылі шпіталь. Паранены Р. Траўгут нейкі час лячыўся ў Людвінаве.

Баі паўстанцаў з карнымі атрадамі ўладаў вяліся з пераменным поспехам. За першымі перамогамі пайшлі адно за адным паражэнні. І добрыя, і дрэнныя навіны чулі сем’і паўстанцаў найперш ад Э. Ажэшкі. Часам яна ездзіла разам з Р. Траўгутам у яе шасцярной карэце, што забяспечвала хоць нейкую бяспеку. Кіраўнік палескага паўстанцкага атрада многа гутарыў з маладой жанчынай, расказваў ёй пра мужнасць і адвагу паўстанцаў, захапляўся подзвігам беларускай сялянкі Магдаліны Волкавай з вёскі Падлессе.

Калі палескі паўстанцкі атрад быў разбіты пад Коўна, Р. Траўгут ацалеў. Ён знайшоў прытулак у Людвінаве. Некалькі дзён хаваўся ў пакойчыку, дзе некалі была школа. Паўсюль на Палессі пачаліся арышты. Некалькі разоў абшуквалі і дом Ажэшкаў. Заставацца тут было рызыкоўна, і Р. Траўгут пачаў думаць, як дабрацца туды, дзе грымела яшчэ паўстанне, – у Варшаву. І зноў выратавала Э. Ажэшка. Яна прапанавала такі план: трэба ехаць у самай багатай карэце па галоўнай, запруджанай казакамі дарозе. На пытанне, хто едзе, адказваць, што шляхцянка вязе хворага брата ў Брэст да доктара. Хітрасць Э. Ажэшка ўдалася. Яны паспяхова дабраліся да Брэста. Знаёмыя дапамаглі Р. Траўгуту перабрацца праз Буг, і ён трапіў у Варшаву, дзе ўзначаліў паўстанне.

Э. Ажэшка затрымалася на тыдзень у Брэсце ў сваіх сваякоў і вярнулася ў Людвінава. Там чакалі яе сумныя навіны. Царскія каты залілі Палессе крывёю. Муж і Фларэнт Ажэшкі былі арыштаваны. Пазней першы быў сасланы ў Сібір. Маёнтак Людвінава канфіскаваны. Без сродкаў на пражыццё, без блізкіх і сяброў самотная Э. Ажэшка пражыла ў Людвінаве цяжкую зіму 1863-64 гг. Часта ездзіла на магілу палеглых у баях паўстанцаў. Над гэтай магілай яна дала клятву: ніколі не ведаць бляску свету, нікчэмнай яго весялосці, ніколі не здраджваць ідэалам дабра, справядлівасці і свабоды, за якія выйшлі на змаганне і палеглі тыя, хто ў гэтай магіле.

У 1864 годзе Э. Ажэшка пакінула Палессе і вярнулася ў бацькоўскі маёнтак непадалёку ад Гродна. Гэта была ўжо сталая жанчына, якая шмат перадумала і перажыла. Імкненне асэнсаваць свае жыццёвыя набыткі падштурхнула да творчай працы. Патрэба такая была яшчэ ў Людвінаве. У першым сваім творы “ У галодны год” адлюстраваны назіранні пісьменніцы над жыццём любвінаўскіх сялянаў у галодны 1859–1860 гг. Ужо ў першым сваім творы яна стала на абарону прыгнечанага беларускага сялянства. З таго часу да апошніх гадоў жыцця яна служыла ідэалам дэмакратыі і гуманізму, славіла традыцыі нацыянальна-вызваленчай барацьбы нашага народа.



***Дом-музей Э. Ажэшка ў г. Гродна***

На схіле сваіх дзён хворая Э. Ажэшка вярнулася думкамі ў сваю маладосць на Палессе. Яна стварыла цыкл навелаў пра сваіх сяброў, самаахвярнікаў-паўстанцаў, пад агульнай назвай “Gloria victis” (“Слава пераможным”). У зборніку пісьменніца вяртаецца да праблем Паўстання, нагадваючы пра гераізм і трагедыі яго ўдзельнікаў, услаўляе актыўны патрыятызм і падкрэслівае гістарычнае значэнне Паўстання. “Дакументальная” мова Э. Ажэшка спалучаецца з сапраўдным лірызмам,

паэтыкай і гераічным пафасам, яна называе людвінаўскі перыяд жыцця сваімі ўніверсітэтамі, раскрываючы ідэйную накіраванасць сваёй творчасці.

Праз некалькі гадоў лёс зноў прывёў пісьменніцу на Берасцейшчыну. На гэты раз на Ляхаўшчыну. Вясной 1908 года пісьменніца шукала месца для адпачынку. Яна не была прыхільніцай модных курортаў, а звычайна адпачывала ў вёсках на Гарадзеншчыне. На гэты раз ёй захацелася выбраць нешта іншае і выбар паў на Флер'янова: "я прагну ў жыцці яшчэ раз правесці лета на шчырай, сапраўднай літоўскай вёсцы, карыстаючыся гасціннасцю Бохвіцаў, якія тут уладкавалі выгодны і ладны пансіянат для людзей такіх, як я, у вясковым значэні бяздомных" [2, с. 110].

Імя Бохвіцаў найхутчэй Э. Ажэшка было не новым. Гэта досыць вядомы род на Беларусі. Дзед тагачаснага гаспадара Флер'янова быў вядомы як пісьменнік і філосаф, які пісаў па-польску. Вышэйшую адукацыю не атрымаў, аднак многа дасягнуў самаадукацыяй. Быў чалавекам досыць начытаным. Асабліва захапляўся французскай прозай і чытаў яе ў арыгінале. Многа часу аддаваў гісторыі журналістыкі, склаў бібліяграфію польскіх перыядычных выданняў, сабраў вялікую калекцыю газет, часопісаў.

Э. Ажэшка са сваёй сяброўкай Марыняй прыехалі ў Флер'янова, сад і ваколіцы якога радавалі вока. Тое, што шукала Э. Ажэшка для свайго адпачынку, яна знайшла ў пансіянаце Бохвіцаў: і свежае паветра, і сапраўдную гасціннасць, і шмат кветак для гербарыяў. Паміж Э. Ажэшка і Тадэвушам Бохвіцам узнікла сімпатыя адзін да аднаго, якая перарасла ў сяброўства. Паміж імі пачалася перапіска, пачалася тут жа ў Флер'янове. Лісты перасылаліся з пакоя ў пакой. Гэта была сяброўская размова двух людзей, якія паважалі адзін аднаго.

У вялікай эпісталярнай спадчыне Э. Ажэшка лісты да Т. Бохвіца складаюць цэлы том. Даследчыкі творчасці пісьменніцы лічаць, што яны заключаюць літаратурную цікавасць не толькі як дакументы свайго часу, але і як мастацкая з'ява. Э. Ажэшка дзялілася са сваім сябрам поглядамі на месца пісьменніка ў грамадстве, раскрывала сваю творчую лабараторыю, давала ацэнкі творчасці пісьменнікаў-сучаснікаў: Г. Сянкевіча, М. Канапніцкай, У. Рэйманта, Б. Пруса і інш., вярталася ў гады маладосці, расказвала пра свой удзел у нацыянальна-вызваленчым руху, паказвала адметнасць працы творцы ва ўмовах цэнзуры, адкрывала Т. Бохвіцу і свае гаспадарчыя хлопаты.

Як бачым, духоўнае сталенне пісьменніцы, фарміраванне светапогляду і вырашэнне ўсяго яе далейшага лёсу звязана з Берасцейшчынай. Пісьмы Э. Ажэшка да Т. Бохвіца – гэта "гісторыя душы" пісьменніцы, грамадскай дзеячкі, мецэнаткі, жанчыны.

У Флер'янове Э. Ажэшка вяла актыўны адпачынак. Былі праходкі па парку і ваколіцах, былі паездкі разам з Т. Баховіцам па наваколлі, наведваліся да суседзяў-шляхціцаў, дзе іх чакалі цікавыя сустрэчы. Ёсць меркаванне, што пісьменніца запісвала фальклор Ляхаўшчыны. Пра гэта сведчыць легенда, апублікаваная ў кракаўскай газеце "Час". У ёй пісалася, як паявіліся на Ляхаўшчыне ў ваколіцах Флер'янова паны, у тым ліку і Бохвіцы.

У 1909 годзе здароўе Э. Ажэшка імкліва пагаршалася. У маі 1910 года яе не стала.

Дом Бохвіцаў ацалеў да нашых дзён. У ім размешчана праўленне мясцовага калгаса. Засталіся рэшткі некалі такога прыгожага парка. Расце і набірае сілы дуб, пас-

аджаны рукой Э. Ажэшка. Нажадь, былая сядзіба не вабіць цяпер дагледжанасцю, багаццем кветак, цудоўным садам. Яна чакае дбайнага свайго гаспадара.

Э. Ажэшка пісала на польскай мове, але заняла ў гісторыі беларускай літаратуры асаблівае месца. Пісьменніца са спагадай і павагай ставілася да працавітага беларускага народа, вывучала яго жыццё і побыт, любіла беларускія пейзажы, сабрала багаты і арыгінальны фальклорны матэрыял.

**Літаратура**

1. Ажэшка, Э. Зімовым вечарам. – Мінск : Маст. літ., 2009. – 253 с.

2. Галава, В. Флер'ятонаўскія зарніцы // Памяць. Гісторыка-дакументальная хроніка Ляхавіцкага раёна. – Мн., 1989. – С.110.

3. Лявонава Е. «Каралева жывога слова»: пра творчасць Элізы Ажэшка // Роднае слова, 1996, № 6. – С. 31–34.